одного обелиска – обелиска Рамсеса II из Луксора [2, IV. CCCXX-CCCXXI].

Но, тем не менее, обелиски действительно представляют собой солярные символы. Некоторые же современные исследователи начинают приписывать им совершенно иные, иногда даже неожиданные функции.

Так, существует мнение о том, что «помимо представления обелиска с камнем бенбен на вершине в качестве первозданного холма или лестницы в Небо, существовало отождествление обелисков с Осью Мира, которая «протыкает» насквозь все три (или хотя бы два) мира Вселенной» [10]. Автор данного предположения считает, что «обелиск представляет собой швартовочный столб при переходе с реки одного мира на реку другого мира, и этим он представлен в небесном Дуате» [10].

Таким образом, очевидно, что существует проблема понимания назначения древнеегипетских обелисков в историографии и данная тематика для египтологических исследований вполне актуальна.

**Литература**


1. Description de l'Egypte. Néret Gilles. Köln, 1995/2002.
2. Champollion Jean-François. Monuments de l'Egypte et de la Nubie.Paris (France): Firmin Didot Frères, 1845. - [2], 7p., leaves CCCI-CCCCXLVI.
3. *Lepsius C. R.* Denkmaeler aus Aegypten und Aephiopien. Berlin, 1849 – 1859. Tafelwerke, Abtl. II - III [Electronic resource]. - ULB-Halle, letzte Änderung 10/2004. Mode of access: http://edoc3.bibliothek.uni-halle.de/lepsius.
4. *Sethe K.* Urkunden der 18. Dynastie. Leipzig, 1906. Erster und Zweiter Band.
5. *Moldenke, Charles E.* The New York Obelisk. Cleopatra's Needle. New York, 1891.
6. *Budge, Wallis E. A.* Cleopatra's needles and other Egyptian obelisks. London, 1926.
7. Habachi L. The Obelisks of Egypt. Sky-scrapers of the past. London, 1977.
8. *Nicholson P., Shaw I.* The Dictionary of Ancient Egypt. The British Museum. The American University in Cairo Press, 2002.
9. *Дьяконов И. М.* Афразийские языки. // Языки Азии и Африки. М., 1991. - Т. IV. Книга 2. С. 35–68.
10. Развитие представлений о мироустройстве и его результаты в древнеегипетской храмовой архитектуре Нового царства [Elect. resours]. Интернет-адрес: http://egypt.boom.ru/egyptboom/polka/autor/05-15.htm.


## ТЭХНАЛОГІЯ ВЫТВОРЧАСЦІ ТЫТУНЁВЫХ ЛЮЛЕК, ЗНОЙДЗЕНЫХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ


### П. С. Курловіч-Бяляўская


Тытунёвыя люлькі – гэта прыстасаванні для палення тытуню. Яны сутракаюцца ў слаях XVII – XIX стагоддзяў і з'яўляюцца частай знаходкай у гарадах, мястэчках, вёсках, сядзібах Беларусі. Традыцыйна сярод тытунёвых люлек вылучаюцца «галандскія», характэрныя для

Паўночнай Еўропы, і «турэцкія», характэрныя для поўдню Еўропы і Бліжняга Усходу.

Асаблівасці тэхналогіі вытворчасці тытунёвых люлек прывялі да наяўнасці ў кожнага выраба чатырох груп прыкмет, якія дазваляюць максімальна падрабязна прааналізаваць любую люльку. Гэта яе марфалогія, склад фармовачнай масы, характар апрацоўкі паверхні і арнаментацыя вырабу. Паколькі падзел люлек на «галандскія» і «турэцкія» з'яўляецца прынцыповым, то кожную групу прыкмет трэба разглядаць паралельна для абедзвюх груп вырабаў.

Найбольш істотнай прыкметай з'яўляецца марфалогія люлькі. «Галандскія» экземпляры складаюцца з чашачкі і маналітнага цыбука. Пры гэтым, ён можа быць living рознай даўжыні, змяшчацца пад розным кутом (вострым, прамым ці тупым) да чашачкі. Вылучаюцца дадатковыя элементы, у прыватнасці, найбольш часта на донцы выраба сустракаецца выступ, які ўтвараўся пры пракалванні адтуліны ў цыбуку і звычайна называецца ножкай [1, с. 71]. Яго функцыянальнае прызначэнне – падстаўка, упор для падвешвання і прытрымлівання, месца кляйма [2, с. 252].

«Турэцкая» люлька складаецца з полай галоўкі (тулава) з чашачкай (місачкай) для тытуню і з цэўкі з гняздом для цыбука [3, с. 67]. Таксама вылучаюцца і дадатковыя элементы, такія як кіль, валік па краю цэўкі, дыск у аснаванні чашачкі [4], паддон.

Пры разглядзе складу фармовачнай масы адзначым, што сыравіна павінна была быць абавязкова высокаякасная, гліна падбіралася тлустая з мінімальнай колькасцю пяску. Паколькі для вытворчасці люлек неабходна асаблівая пластычнасць матэрыялу, то сыравіна для іх праходзіла спецыяльную апрацоўку: прасеў, прамыванне, адстойванне і г.д [5, с. 56]. У выніку атрымлівалася гліна, практычна пазбаўленая якіх-небудзь уключэнняў. Толькі асобныя рэдкія экземпляры ўтрымліваюць дробныя ўкрапленні мінеральных дамешкаў.

«Галандскія» тытунёвыя люлькі, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі, былі выраблены з высокаякаснай вогнетрывалай белай гліны. «Турэцкія» тытунёвыя люлькі маглі вырабляцца з рознага кшталту керамічнай масы. Вядомы таксама касцяныя [6, с. 17] і драўляныя [3, с. 69] вырабы.

Паверхня «галандскіх» тытунёвых люльках старанна глянцавалася. Апрацоўка паверхні «турэцкіх» тытунёвых люлек характарызуецца значна большай разнастайнасцю. Так, яны маглі быць тэракотавымі (часам з падглянцаваннем), глянцаванымі (у тым ліку чырвонаглянцаванымі ці пафарбаванымі чырвой фарбай), паліванымі (паліва магла быць зялёная, жоўтая ці карычневая), дымленымі,

ангабаванымі (часта чырвоная гліна ангабавалася белай), распісаныя фарбай ці пакрытыя эмаллю.

Арнаментацыя тытунёвых люлек адрознівалася як па тэхніцы выканання, так і стылістычна. Гэтая прыкмета з’яўляецца найбольш блізкай у «галандскіх» і «турэцкіх» вырабаў. Часта ў абедзвюх групах сустракаюцца вельмі падобныя матывы. Па тэхніцы выканання арнамент мог быць штампаваным (выкананым спецыяльным штампам ці атрыманым пад час фармоўкі) і разбяным. Вырабы маглі зусім не мець дэкору, ці адрознівацца вельмі сціплым аздабленнем. А маглі уяўляць сабой складаную кампазіцыю, якая надае люльцы зусім незвычайную форму.

Усе адзначаныя вышэй прыкметы, а асабліва марфалогія вырабу, залежаць ад спосабу фармоўкі тытунёвай люлькі.

«Галандскія» тытунёвыя люлькі выраблялася выключна шляхам выціскання ў двухчастковай гладкай ці арнаментаванай форме. Пры гэтым, самі формы маглі быць гліняныя ці драўляныя [7, с. 150]. Больш дасканалыя вырабы фармаваліся ў металічных прыстасаваннях (бронзавых ці латунных). Спачатку стваралася нарыхтоўка ў выглядзе валіка, у якога быў патоўшчаны адзін край (на месцы будучай чашачкі). Затым праз яе прапускалі дрот, які павінен быў сфарміраваць дымаходны канал. Усё разам закладвалася ў форму, якая шчыльна зачынялася і змяшчалася ў прэс. Потым пры дапамозе адмысловага інструмента ўтваралася камера чашачкі. Нарэшце, выдаляліся лішкі гліны, адмяралася даўжыня люлькі, загладжваліся ліцейныя швы [2, с. 253].

«Турэцкія» тытунёвыя люлькі маглі вырабляцца трыма спосабамі. Самым распаўсюджаным з’яўлялася ручное выцісканне ў двухчастковай гладкай ці арнаментаванай форме. Гэты механізм быў вельмі падобны да механізму вытворчасці «галандскіх» вырабаў. Так, для гэтага ў форму закладваўся кавалак сыравіны, а потым туды праз спецыяльныя адтуліны устаўляліся кліны (хутчэй за ўсё драўляныя) па накірунках цэўкі і чашачкі, якія ў выніку ўтваралі іх унутраную прастору. Затым паловы формы раз’ядноўваліся, выраб даставалі, выцягвалі адзін з кліноў і пераходзілі да аздаблення люлькі. Потым унутраную прастору вырабу аб’ядноўвалі, для чаго рабілі адтуліну ў перагародцы, якая заставалася паміж клінамі. Нарэшце падрыхтаваныя люлькі адпраўлялі ў печ для абпалу [4].

Пераважная большасць «турэцкіх» тытунёвых люлек выраблена ў форме. Пакуль адзінай вядомай знаходкай формы на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца керамічная створка з няўдялым адбіткам з Полацка [6, с. 22]. Верагодна, большасць формаў выраблялася з дрэва. Аб выкарыстанні формы сведчыць спецыфічны знешні выгляд люлькі, а таксама,

наяўнасць швоў на яе тулаве. Асабліва добра яны бачны з боку гнязда для цыбука.

Пры вытворчасці «турэцкіх» тытунёвых люлек магло выкарыстоўвацца ганчарнае кола. Выкарыстанне менавіта такой тэхналогіі пацвярджаецца наступнымі прыкметамі гатовага вырабу: адсутнасць швоў, якія застаюцца пасля выкарыстання формы, наяўнасць швоў ці адбітку цэўкі у месцы яе прымацавання да чашачкі, тонкія кальцавыя лініі па паверхні незагладжаных люлек, канцэнтрычная разьба, падобнасць формы чашачкі да посуду [8, с. 61]. На тэрыторыі Беларусі яны выяўлены ў Мінску (4 экземпляры). На жаль, па захаваўшыхся фрагментах нельга прасачыць цалкам іх форму.

«Турэцкія» тытунёвыя люлькі, выраблены трэцім спосабам, з'яўляюцца разбянымі. У якасці сыравіны для ніх маглі выкарыстоўвацца дрэва, косць і гліна. Хутчэй за ўсё, такія люлькі мясцовай вытворчасці. Іх узнікненне можа быць абумоўлена багатымі разбярскімі традыцыямі краю.

Драўляныя люлькі былі выяўлены В.Е. Собалем пад час раскопак Мінска. Пры іх вытворчасці выпілоўвалі, выразалі, высвідроўвалі ці выпальвалі з камлей найбольш зручнай канфігурацыі патрэбную форму [3, с. 69]. Цалкам верагодна, што такімі люлькамі карысталіся бяднейшыя гарадскія слаі насельніцтва. Такімі ж вырабамі маглі карыстацца і сяляне, але сельскія паселішчы ранняга новага часу на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца вельмі слаба вывучанымі, да таго ж іх культурны слой амаль не захоўвае арганіку.

Неабходна заўважыць, што разбяныя і ганчарныя люлькі нельга аднесці да сусветна распаўсюджаных вырабаў. Яны, верагодна, з'яўляюцца мясцовымі. Іх вытворчасць стала своеасаблівай рэгіянальнай спробай далучэння да глабальных побытавых традыцый той часткі насельніцтва, якая пераняла культуру ўжывання тытуню, але не здолела зрабіць гэта пры дапамозе традыцыйных прыстасаванняў. Таму яна была вымушана стварыць уласную спрошчаную тэхналогію.

Такім чынам, асаблівасці тэхналогіі вытворчасці тытунёвых люлек XVII – XVIII стагоддзяў з'яўляюцца падставай для вылучэння чатырох груп прыкмет гэтых вырабаў: марфалогіі люлькі, складу фармовачнай масы, характару апрацоўкі паверхні, арнаментацыі. Пры гэтым, ужо першапачаткова трэба ўлічваць каардынальныя адрозненні паміж «галандскімі» і «турэцкімі» тытунёвымі люлькамі, якія з'яўляліся прадукцыяй дзвюх абсалютна розных тэхналагічных традыцый.

Усе тэхналагічныя прыкметы люлькі, а асабліва яе марфалогія, залежаць ад спосабу фармоўкі вырабу. «Галандскія» тытунёвыя люлькі выраблялiся ў двухчастковай форме. «Турэцкія» вырабы ў сваёй

большасці – ручным выцісканнем у двухчастковай форме, а таксама фармаваннем на ганчарным крузе і разбярствам з дрэва, гліны ці косці.


**Літаратура**

1. *Розенфельдт Р. Л.* Московское керамическое производство XII – XVIII вв. / Под общ. ред. Б.А. Рыбакова // Археология СССР. Свод археологических источников. М., 1968.
2. *Пошернева Т. Н.* Белоглиняные курительные трубки из раскопок Охтинского мыса (по материалам работ 2010 г.) / Бюллетень Института истории материальной культуры РАН. 2 (охранная археология). СПб, 2012. №1. С. 251–330.
3. *Угрыновіч У., Собаль В.* Сувеніры стагоддзяў // Мастацтва Беларусі. 1984. №10. С. 67–71.
4. Интернет-адрес: http:// opentextnn.ru/history/archaeology/library/?id=836.
5. *Левко О. Н.* Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии. Минск, 1992.
6. *Соловьев А. А.* Керамические люльки в Полоцке XVII – XVIII веков // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. История. 2007. №1. С. 16–25.
7. *Sprainaitis R.* XVII – XIX A. Olandisko tipo pypkes Klaipedos kulturiniuose sluoksniuose / Vakaru baltu archeologija ir istorija. 1989. P. 150–156.
8. Люлька в історії та гончарстві України: у 2 кн. Опішне, 2008. – Кн. 1: Глиняні люльки XVII – XVIII століть (за матеріалами Полтавщини) / О. Коваленко. 2008.


## ИСТОРИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО АРХИВА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В 1991 – 2011 гг.


**К. А. Ланевич**


Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ) – крупнейшее хранилище документов по истории Беларуси XX в., ведущее учреждение Государственной архивной службы страны.

Свою прямую историю Национальный архив Республики Беларусь ведет с 28 мая 1927 г., когда Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР законодательно оформили образование Центрального архива Октябрьской революции. Первоначально коллектив архива состоял из 4 человек, располагался в Минске в здании церкви Святого Духа бывшего мужского православного монастыря по ул. Бакунина, 1. Возглавил архив Геннадий Игнатьевич Бобровский.

Однако за 85 лет деятельности архив неоднократно претерпевал изменения: реорганизации, перемещения. Так, архив четырежды менял свое название: 1927 – 1938 гг. – Центральный архив Октябрьской революции БССР, 1938 – 1993 гг. – Центральный архив Октябрьской революции и социалистического строительства, 1993 – 1995 гг. – Белорусский государственный архив, с 1995 г. – Национальный архив Республики Беларусь. Что касается расположения архива, то нужно сказать, что